***Вольга Шарая***

# ПАМІНАЛЬНЫЯ ПРАКТЫКІ Ў ПОСТПАСХАЛЬНЫ ПЕРЫЯД: АРХАІЧНАЯ ЗАХОДНЕПАЛЕСКАЯ ТРАДЫЦЫЯ

Адной з актуальных праблем вывучэння традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў з'яўляецца вывучэнне лакальных традыцый, звязаных з памінаннем памерлых. Асаблівую цікавасць прадстаўляюць архаічныя феномены, якія да нашага часу захаваліся на Палессі, у прыватнасці, традыцыя памінання памерлых, час правядзення якой прыходзіўся на перыяд пасля Пасхі. У гэты час асноўнымі памінальнымі днямі лічыліся: чацвер на пасхальным тыдні — «Пасха мёртвых»; Провады − нядзеля, панядзелак на Фаміным тыдні; Радуніца − аўторак, радзей панядзелак на Фаміным тыдні. Вынікі картаграфавання паказалі, што хранонім *Радуніца*, а таксама наведванне могілак на Радуніцу былі распаўсюджаны пераважна ва Усходнім Палессі, у той час як ушанаванне Наўскага чацвярга зафіксавана пераважна на захадзе Палесся і фрагментарна ў Падняпроўі. Такім чынам, хранонімы *Наўскі Вялікдзень* і *Радуніца*, як адзначае Т.А.Агапкіна, у арэалагічным аспекце знаходзяцца паміж сабой у адносінах дадатковага размеркавання [1, с. 85−88].

Падчас нашых палявых даследванняў у Заходнім Палессі інфармантам − карэнным жыхарам рэгіёну − задавалася наступнае пытанне: «Ці была ў вас і што для вас азначае Радуніца?» Атрыманы наступныя адказы: «Нэ було Радуніцы», «Я нэ знаю, можэ у якых местах і зроду було у вовторок после проводнэйі нэділі, после Пасхы, а у нас чэтвэр Навскы» (Ставок Пінскага р-на); «На Вэлыкдэнь на моглыца мы ходым у чэтвэр. У нас Радовніцы нэма, Намськы Вэлыкдэнь у нас у чэтвэр после Вэлыкодня» (Дастоева Іванаўскага р-на) [2].

Даючы адмоўны адказ на пытанне аб святкаванні Радуніцы ў Заходнім Палессі, інфарманты адзначалі значымасць для іх Наўскага Вялікадня: «На Навскэ Вэліконне на могліца у нас ідуть і тэпэр» (Глінка Столінскага р-на); «Мы ходымо на моглыца зарэ оно на Намскэ Вэлыконне» (Наваселле Пінскага р-на); «У нас на моглыца ходылы − это був Намскы Вэлыкдэнь» (Буса Іванаўскага р-на); «У чэтвэр, на Навскы Вэлыкдэнь, нэслы на кладбішча яечка, хліб» (Чухава Пінскага р-на); «Намськы Вэлыкдэнь – чэтвэр по Вэлыконню. Ідуть на кладбішчэ» (Спорава Бярозаўскага р-на). У дадзеным рэгіёне абрад захаваў архаічныя рысы, паколькі захавалася само паняцце *наўскі*, якое прама ўказвае на характар дзеянняў.

У Заходнім Палессі выкарыстанне хранонімa *наўскі* ў постпасхальны перыяд не з'яўляецца выключэннем. У рамках іншага буйнога памінальнага цыкла − на Тройцу таксама ёсць аналагічны дзень (чацвер пасля Тройцы), які называецца *Намска Труйца*. Памінанне продкаў у чацвер пасля Пасхі («Намскы», «Навскы», «Сухы чэтвэр») – шырока распаўсюджана ў Заходнім Палессі.

Даныя палявых даследаванняў паказваюць, што характэрная рыса велікоднага памінальнага комплексу ў асобных лакальных традыцыях - вывешванне вопраткі для памерлых родзічаў. Адна з інфармантак адзначае: «Навськы Вэлыкдэнь по Вэлыконню у чэтвэр. У чэтвэр шлы і тэпэр ходым на моглыцы. Пэрэд тым, ек іті на моглыцы, вывішвалы і тэпэр усі вішають одэжу, врано вішаем, потом забыраемса і ідэмо. Дэ на мотуз, дэ на пэрэлазы, ек хто вішае. Я на мотуз вішаю. Сорочку повісымо, да сподныцу, да фартуха, да хустку, да шэ ручныка, да ганавыцы, чоловікову рубашку, о гэтэ усе. Кажуть, шо прыдуть, да будуть убыратыса. І жоночу, і мужчынску одэжу, і настілныка, і ек у мэнэ діты умыралы, то я дытячу одэжу навішаю. А самы ідэм на моглыцы. Усі сходылыса на моглыцах. Прыдэм з моглыц, пообідаем, знымаемо тую одэжу пуд вэчор» (Тышкавічы Іванаўскага р-на).

Цікавасць уяўляе група вёсак у Івацэвіцкім р-не Брэсцкай вобл., у якіх існавала вывешванне вопраткі памерлым: «После Паскы у сухы чэцьвэр Навскы Вэлікдзень. Поснедалі, кошэля выносят, кошэля нэслі, настэлныца заслана была, гэта, шо была Паска у ім. Эту настэлныцу, этого кошэля вешают. Маці моя то неколі сорочку мацеры своей вешае, усёго плота обвешае. Тому лату, тому лату. Хто умэр, тому і лату, вешае. Мацеры, сэстра ейі умэрла, то сподніцу. Пэрэодеватіса ідуть мёртвые. Пэрэодеватіса на год раз» (Вялікая Гаць Івацэвіцкага р-на); «Сухі чэцвэр после Паскы. Чэцвэр – это покойніков празнік. І вывешвалі одзёжу всю красівую. Это для покойніков. Это у нас, і на Вульке [Вулька-Целяханская – *В.Ш.*]. То тожэ такэе заведзенне і у Сьвятой [Святая Воля – *В.Ш.*] не́колі я была в гэты дзень у Сьвятой, то вывесены і хусткы этые цветоватые і одзёжа красівая» (Бабровічы Івацэвіцкага р-на); «Неколі моя мама казала, чэтвэр после Вэліконня то Намскы Вэлікдэнь назывався, то выносілі одэжу покойнікам: сорочку мужчынску і бабску, хто родня, у родні е помэрлі, сподніцу, хустку, вынэсэ на клэть повесыт» (Амяльная Івацэвіцкага р-на). Звычай вывешвання вопраткі памерлым родзічам у чацвер пасля Вялікадня зафіксаваны намі ў вёсках Бабровічы, Вялікая Гаць Івацэвіцкага р-на, якія ў мінулым уваходзілі ў Вядскую воласць, а таксама і ў суседніх вёсках. Пры гэтым сам чацвер у дадзеных лакальных традыцыях мае розныя назвы: «Сухы чэцьвэр і Навскы Вэлікдзень» (Вялікая Гаць), «Сухы чэцьвер» (Бабровічы), Намскы Вэлікдэнь (Амяльная), «Сухы чэтвэр – мёртвых Паска» (Выганашчы).

Агульным для разглядаемых лакальных традыцый з яўляецца не толькі дзень і традыцыя вывешвання вопраткі памерлым, але і дзень наведвання могілак – другі дзень Вялікадня: «До сходу сонца ішлі на моглiца. На другы дзень Вэліконня» (Вялікая Гаць Івацэвіцкага р-на); «На другі дэнь Вэліконня. Все-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

все. І хвартушкы гэты вешалі» (Амельная Івацэвіцкага р-на); «На другы дзень Паскы» (Бабровічы, Выганашчы Івацэвіцкага р-на).

У асобных лакальных традыцыях наведванне памерлых родзічаў было ў першы дзень Вялікадня і на «Навскы Вэлікдэнь». Пры гэтым можа праслежвацца дыферэнцыяцыя па прымеце мужчынскі/ жаночы: «На могліца ходылі на пэрвы дэнь Вэліконня, ранэнько до снідання ідэм, Богу молімса і ложым там покойнікам шчо у дома у нас естека... І у чэтвэр после Паскы ходылі, Навскы Вэлікдэнь. У нас на пэрвы дэнь мужыкы ідуть з жэншчынамы. А вжэ на Навскы Вэлікдэнь мужыкы нэяк нэ ідуть, только жэншчыны» (Рудня Івацэвіцкага р-на).

Днём памінання памерлых у поствелікодны перыяд з'яўляюцца і Провады: «Проводы. Колы Паска, то у дру́гу нэділю. На могылы ідуть. Проводы – мэртвых Вэлыкдэнь звалы» (Олтуш Маларыцкага р-на); «Проводы. Ідуть на молыца, кажны до свойіх» (Арэхава Маларыцкага р-на».

З пасхальным і постпасхальным перыядам звязаны шэраг забарон. Градавая серада – хранонім, які адносіцца да дня, калі, згодна з народнымі ўяўленнямі, нельга было працаваць у полі, каб град не пабіў ураджаю. Звычайна гэта серада пасля Вялікадня: «Градовая сэрэда – после Вэлыконня. Святковалы, коб град нэ быв пашню. У полі нэ робылы (Лозічы Пінскага р-на).

У некаторых лакальных традыцыях Градавая серада – гэта серада пасля Вялікадня і серада пасля Тройцы, і акрамя забароны работы ў полі меў месца шэраг іншых забарон: «В градовую сэроду ны можна: ны шыты, ны прясты, ны косыты, ны рубаты, ны молоты, ны товчы. Картоплі пырыбырають бало. Там быз ножя, быз голкы, быз сокіры. І ны пололы. Бо будэ гряд, гряд всэ побъе» (Сіманавічы Драгічынскага р-на) [3, с. 353].

**Спіс літаратуры:**


1. Агапкина, Т.А. Очерки весенней обрядности Полесья / Т.А. Агапкина // Славянский и балканский фольклор / Этнолингвистическое изучение Полесья. – М. : Индрик, 1995. – С. 21–107.
2. У працы выкарыстаныя матэрыялы з архіва аўтара, якія сабраныя ў выніку палявых даследаванняў у Заходнім Палессі.
3. Климчук, Ф.Д. Духовная культура полесского села Симоновичи / Ф.Д. Климчук // Славянский и балканский фольклор / Этнолингвистическое изучение Полесья. – М.: Индрик, 1995. – С. 335–380.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ